ДЗЯРЖАЎНАЯ УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«АКАДЭМІЯ АДУКАЦЫІ»

# ВУЧЭБНЫ МОДУЛЬ
# «Сістэма работы настаўніка па падрыхтоўцы навучэнцаў да цэнтралізаванага экзамену па вучэбным прадмеце “Беларуская мова”»
**для навучальных праграм павышэння кваліфікацыі настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі**

Мінск, 2025

Распрацоўнік модуля:

Чахлова Т.Ф. – метадыст вышэйшай катэгорыі ўпраўлення дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія адукацыі».

Рэцэнзент:

Зубрыліна І.В., прарэктар па вучэбнай рабоце дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія адукацыі», кандыдат педагагічных навук, дацэнт.

Рэкамендаваны да зацвярджэння:

кафедра педагогікі і менеджменту адукацыі дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія адукацыі».

Пратакол паседжання ад 19.12.2025 №14

навукова-метадычная рада дадатковай адукацыі дарослых дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія адукацыі».

Пратакол паседжання ад 20.12.2025 №10

# УВОДЗІНЫ

Вучэбны модуль распрацаваны для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, якія ажыццяўляюць адукацыйны працэс па навучальным прадмеце «Беларуская мова» па падрыхтоўцы навучэнцаў да цэнтралізаванага экзамену (далей – ЦЭ).

Адукацыйны працэс ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі арганізуецца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, адукацыйнымі стандартамі агульнай сярэдняй адукацыі, іншымі нарматыўнымі прававымі актамі.

Змяненні, якія адбываюцца ў адукацыі навучэнцаў, прад'яўляюць новыя патрабаванні да прафесійнай дзейнасці настаўніка па арганізацыі адукацыйнага працэсу па вучэбным прадмеце «Беларуская мова». Настаўніку неабходна забяспечыць адзінства вучэбнай і выхаваўчай дзейнасці ў засваенні вучэбнай праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, варыятыўнасць адукацыйнага працэсу, роўны доступ усіх вучняў да якаснай адукацыі.

Актуальнасць правядзення павышэння кваліфікацыі настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, якія арганізуюць адукацыйны працэс па навучальным прадмеце «Беларуская мова» па падрыхтоўцы да ЦЭ, абумоўлена:

укараненнем у адукацыйны працэс на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі сістэмнага падыходу;

абнаўленнем зместу агульнай сярэдняй адукацыі ў цэлым, а таксама зместу, методыкі навучання і вынікаў асваення па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» у адпаведнасці з патрабаваннямі сістэмнага падыходу;

выкарыстаннем на ўроках па навучальным прадмеце «Беларуская мова» эфектыўных адукацыйных практык, накіраваных на рэалізацыю комплекснага падыходу ў падрыхтоўцы навучэнцаў да ЦЭ па адпаведным навучальным прадмеце;

зменамі патрабаванняў заказчыкаў (навучэнцаў, законных прадстаўнікоў навучэнцаў, устаноў адукацыі, дзяржавы) да вынікаў асваення па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» ў XI класе на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі.

Вучэбны модуль разлічаны на 8 гадзін навучання.

У рамках навучальнага модуля рэкамендуецца правесці заняткі ў форме інтэрактыўных лекцый, выкарыстоўваць практычныя формы арганізацыі дзейнасці з адпрацоўкай неабходных уменняў і навыкаў слухачоў ва ўдасканаленні работы па падрыхтоўцы навучэнцаў да ЦЭ па беларускай мове.

**Мэта:** удасканаленне прафесійнай кампетэнтнасці настаўнікаў па падрыхтоўцы навучэнцаў да цэнтралізаванага экзамену па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» на прыкладзе тэм, якія выклікалі найбольшыя цяжкасці.

**Задачы:**

садзейнічаць удасканаленню прафесійнай кампетэнтнасці настаўнікаў па пытаннях падрыхтоўкі навучэнцаў да цэнтралізаванага экзамену па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»;

азнаёміць з найбольш перспектыўнымі сучаснымі падыходамі ў навучанні беларускай мове з мэтай павышэння якасці падрыхтоўкі навучэнцаў да цэнтралізаванага экзамену.

**Метады навучання:** праблемны, эўрыстычны, інфармацыйна-рэцэптыўны.

**Сродкі навучання:** навучальныя дапаможнікі, анлайн-рэсурсы, мультымедыйныя прэзентацыі.

**Катэгорыя слухачоў:** настаўнікі беларускай мовы і літаратуры ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

**Форма атрымання адукацыі**: вочная (дзённая).

ПРЫМЕРНАЕ РАЗМЕРКАВАННЕ ВУЧЭБНЫХ ГАДЗІН / ВІДЫ ВУЧЭБНЫХ ЗАНЯТКАЎ
Працягласць навучання – 8 гадзін (у рамках тыднёвага навучання)

Форма атрымання адукацыі – вочная (дзённая)

| Названне тэм | Аб'ём гадзін | Віды вучэбных заняткаў | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Л | ПЗ | С | КС | ВДГ | Тр | Кн | СР |
| 1. Удасканаленне метадычнай кампетэнтнасці настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры па падрыхтоўцы навучэнцаў да цэнтралізаванага экзамену па беларускай мове | 4 | 2 | 2 | | | | | | |
| 2. Удасканаленне прадметнай кампетэнтнасці настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры па падрыхтоўцы навучэнцаў да цэнтралізаванага экзамену па раздзелах беларускай мовы, якія выклікалі найбольшыя цяжкасці | 4 | | 4 | | | | | | |
| ВСЕГО | 8 | 2 | 6 | | | | | | |

* Заўвага: Л - лекцыя; ПЗ - практычныя заняткі; С - стажыроўка; КС - круглы стол; ВДГ – вучэбна-дзелавая гульня; Тр - трэнінг; КН - канферэнцыя; СР - самастойная работа

**Змест**

**1.Удасканаленне метадычнай кампетэнтнасці настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры па падрыхтоўцы навучэнцаў да цэнтралізаванага экзамену (ЦЭ) па беларускай мове**

Сістэмны падыход у падрыхтоўцы навучэнцаў да ЦЭ па беларускай мове як фактар павышэння якасці адукацыі. Выкарыстанне тэставых тэхналогій навучання на ўроках і ў пазаўрочнай дзейнасці. Змястоўна-структурны аналіз тэстаў ЦЭ. Асаблівасці выканання тэставых заданняў групы А і групы В. Паказчыкі маніторынгу вынікаў ЦЭ па беларускай мове. Аналіз тыповых памылак, якія дапускаюцца вучнямі на ЦЭ па беларускай мове. Прычыны ўзнікнення памылак, карэкцыя і рэгуляванне навучальнага працэсу па беларускай мове з мэтай іх папярэджання. Эфектыўныя формы і метады работы па падрыхтоўцы да ЦЭ па беларускай мове. Прадстаўленне настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры ўласнай сістэмы працы па падрыхтоўцы навучэнцаў да ЦЭ.

**2.Удасканаленне прадметнай кампетэнтнасці настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры па падрыхтоўцы навучэнцаў да ЦЭ па раздзелах беларускай мовы, якія выклікалі найбольшыя цяжкасці**

**2.1. Практыкум па выкананні тэставых заданняў па раздзеле «Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія»**

Адрозненне гукаў і літар, уменне ўстанаўліваць паміж імі адпаведнасць; аглушэнне звонкіх перад глухімі і на канцы слоў; вымаўленне свісцячых перад шыпячымі як шыпячых; вымаўленне свісцячых перад мяккімі як мяккіх. Правапіс *у–ў*. Правапіс *у* і *ў* у запазычаных словах. Правапіс мяккага знака і апострафа. Правапіс апострафа пасля частак *двух-, трох-, чатырох-, шмат-*. Правапіс галосных *о, э, а*. Правапіс літар *о, э, а* ў складаных словах і ў словах іншамоўнага паходжання. Правапіс *е, ё, я*. Правапіс літар *е, ё, я* ў складаных словах і ў словах іншамоўнага паходжання, а таксама ў некаторых суфіксах назоўнікаў. Правапіс зычных. Правапіс зычных у запазычаных словах; правапіс некаторых спалучэнняў зычных.

**2.2. Практыкум па выкананні тэставых заданняў па раздзеле «Марфалогія і арфаграфія».**

Складаныя назоўнікі, іх утварэнне і правапіс. Правапіс складаных назоўнікаў праз дэфіс. Складаныя прыметнікі, іх утварэнне і правапіс. Правапіс складаных прыметнікаў праз дэфіс. Правапіс колькасных лічэбнікаў. Правапіс лічэбнікаў *два, тры, чатыры, абодва, абедзве* ў творным склоне. Канчаткі дзеясловаў I і II спражэнняў, іх правапіс. Правапіс канчаткаў дзеясловаў у форме абвеснага ладу цяперашняга часу 2-й асобы множнага ліку. Часціца як службовая часціна мовы. Правапіс часціцы *не* з рознымі часцінамі мовы. Ужыванне часціц *не* і *ні*.

**2.3. Практыкум па выкананні тэставых заданняў па раздзеле «Сінтаксіс і пунктуацыя»**.

Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове (у параўнанні з рускай). Вызначэнне сінтаксічных канструкцый, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы. Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі. Адсутнасць коскі паміж аднароднымі членамі сказа, звязанымі адзіночным размеркавальным злучнікам *або.* Ужыванне двукроп'я і працяжніка пры аднародных членах з абагульняльным словам. Знакі прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі. Адсутнасць коскі ў сказах з параўнальным злучнікам, які стаіць перад выказнікам. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам. Працяжнік паміж дзейнікам, выражаным назоўнікам у форме назоўнага склону, і выказнікам, выражаным фразеалагізмам. Адсутнасць працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, пры наяўнасці перад выказнікам адмоўнай часціцы *не.* Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі членамі. Знакі прыпынку пры адасобленых азначэннях, якія стаяць перад назоўнікам і аддзелены ад гэтага назоўніка дзеясловам-выказнікам. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназалежных сказах. Знакі прыпынку ў складаназалежным сказе з некалькімі даданымі, у якім побач стаяць два падпарадкавальныя злучнікі (ці злучнік і злучальнае слова). Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах. Працяжнік паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах. Двукроп'е паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак. Правілы пастаноўкі знакаў прыпынку паміж часткамі, звязанымі злучальнай, падпарадкавальнай і бяззлучнікавай сувяззю.

# РЭКАМЕНДУЕМАЯ ЛІТАРАТУРА

## Асноўная

1. Цэнтралізаваны экзамен. Цэнтралізаванае тэсціраванне. Беларуская мова: поўны зборнік тэстаў: ЦЭ і ЦТ 2025 г.] / Установа адукацыі «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. – Мінск : Аверсэў, 2025. – 268 с.

2. Беларуская мова. ЦЭ. ЦТ. Тэорыя. Прыклады. Тэсты: дапаможнік: для абітурыентаў і навучэнцаў] / В. М. Сіўковіч. – Минск : Аверсэв, 2025.– 384с.

## Дадатковая

1. Змястоўна-тэхналагічнае забеспячэнне выкладання беларускай мовы : вучэбна-метадычны комплекс / І. Г. Батурына, В. Г. Валошчанка, С. А. Лазукоў, С. В. Мартынкевіч [і інш.]. – Віцебск : Дзяржаўная установа дадатковай адукацыі дарослых «Віцебскі абласны інстытут развіцця адукацыі», 2023. – 147 с.

2. Васілевіч, С. Л. Беларуская мова: 50 тэстаў для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання / С. Л. Васілевіч. – Мінск : Аверсэв, 2021. – 446 с.